# Абмен вопыту паміж рукадзельніцамі г. Ашмяны і в. Паляны

З мэтай абмену вопыту рукадзельніцы і супрацоўнікі аддзялення дзённага знаходжання для грамадзян сталага ўзросту ДУ "ТЦСАН Ашмянскага раёна" наведалі аддзел рамёстваў і традыцыйнай культуры ў в.Паляны, якім кіруе таленавіты і творчы чалавек Валянціна Свірская. Яна пазнаёміла гасцей з гэтым самабытным кутком нацыянальнай культуры, якія былі прыемна здзіўлены ўбачыць тут майстэрню-музей, афармленую ў стылі Беларускай хаткі XIX стагоддзя з выкарыстаннем элементаў народнай культуры нашага рэгіёна. Увазе наведвальнікаў і супрацоўнікаў АДЗП былі паказаны цудоўныя працы, зробленыя з саломкі, дрэва і іншых прыродных матэрыялаў. Тут маюцца вышыўкі, макрамэ, ганчарная справа, фларыстыка, саломапляценне. Заключным этапам стаў майстар клас паміж рукадзельніцамі.

Ад’язджалі госці з вялізнымі ўражаннямі, станоўчымі эмоцыямі і надзеяй, што гэтая паездка паклала пачатак сумеснай працы.







